УКБ 373.2

**Корнева Наталля Мікалаеўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мірскі яслі-сад», аг. Мір, Рэспубліка Беларусь, mir-sad@bar-roo-edu.brest.by*

# ВЫКАРЫСТАННЕ МАЛЫХ ФОРМАЎ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ ДЗЯЦЕЙ МАЛОДШАГА ДАШКОЛЬНАГА УЗРОСТУ Ў РОЗНЫХ ВІДАХ ДЗЕЙНАСЦІ

У рабоце падымаецца праблема развіцця мовы малодшых дашкольнікаў. Апісваецца станоўчы вопыт работы выхавальніка дашкольнай адукацыі па фарміраванні звязнага беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту сродкамі малых формаў беларускага фальклору. Вызначаны асноўныя накірункі, формы, метады і прыёмы развіцця беларускага маўлення дзяцей. Прыведзены прыклады выкарыстання малых форм фальклору ў розных відах дзейнасці малодшых дашкольнікаў.

**Ключавыя словы:** дашкольнік; развіццё мовы; малыя формы; беларускі фальклор; малыя формы фальклору.

**Korneva Natalia Nikolaevna**
*Mirsky Nursery-kindergarten, Mir, the Republic of Belarus, mir-sad@bar-roo-edu.brest.by*

# THE USE OF SMALL FORMS OF BELARUSIAN FOLKLORE IN DEVELOPMENT SPEECHES OF PRESCHOOL CHILDREN IN VARIOUS ACTIVITIES

The work raises the problem of language development of younger preschoolers. The article describes the positive experience of a preschool educator in the formation of coherent Belarusian speech of preschool children by use of small forms of Belarusian folklore. The main directions, forms, methods and techniques of the development of the Belarusian speech of children are determined and contained. Examples of the use of small forms of folklore in various activities of younger preschoolers are given.

**Kee words:** preschooler; language development; small forms; Belarusian folklore; small forms of folklore.

**Уводзіны**. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, беларускую мову роднай лічаць больш за 5 мільёнаў чалавек, што складае 60 % ад усяго насельніцтва краіны. Аднак у жыцці па-беларуску размаўляе толькі трэцяя частка жыхароў Беларусі — каля 2,85 мільёна чалавек.

Авалоданне беларускімі дзецьмі рускай мовай — гэта авалоданне багацейшай крыніцай ведаў, сродак глыбокага рознабаковага развіцця дзіцяці. Авалоданне разам з рускай мовай беларускай складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення ім нацыянальнай культуры, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці.

Авалоданне сродкамі роднай мовы, добрае валоданне ёю забяспечваюць эфектыўныя маўленчыя зносіны дзіцяці з дарослымі і аднагодкамі. Без маўленчых зносін з дарослымі, без моўнага акружэння немагчыма паўнацэннае развіццё дзіцяці, бо менавіта дарослыя перадаюць яму вопыт, веды, уменні, культуру. Навучыць дзіця карыстацца роднай мовай у непасрэдных зносінах з людзьмі, развіць іх вуснае маўленне — асноўная задача маўленчага развіцця дашкольніка.

Развіваць у дзяцей беларускае маўленне неабходна менавіта ў малодшым дашкольным узросце, які з'яўляецца сензітыўным перыядам актыўнага засваення дзецьмі гутарковай мовы, станаўлення і развіцця ўсіх яе бакоў. Для гэтага трэба стварыць маўленчае асяроддзе такім чынам, каб яго развіццёвы патэнцыял быў дастаткова высокім для кожнага дзіцяці ў адпаведнасці з узростам.

Творы беларускага фальклору сваім зместам і формай паступова ўводзяць малога ў свет народнага слова, раскрываюць яго багацце і прыгажосць. Яны далучаць дзіця да гісторыі, мовы, культуры і традыцый роднага краю. Малыя формы дзіцячага фальклору з цікавасцю засвойваюцца маленькімі дзецьмі, бо часцей за ўсё іх праслухоўванне суправаджаецца абыгрываннем, інсцэніроўкай [1, с. 7].

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца вывучэнне эфектыўнасці выкарыстання твораў народнага фальклору як сродка развіцця маўлення дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту праз стварэнне спрыяльных ўмоў для развіцця цікавасці дзяцей да літаратуры і фальклору; знаёмства дзяцей з разнастайнымі формамі фальклору: калыханкі, пацешкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі; пашырэнне слоўнікавага запасу, фарміраванне звязнага маўлення, развіццё гукавой культуры маўлення з дапамогай фальклору; фарміраванне ў дзяцей эмацыйнага суперажывання, эмацыйнага водгуку на твор вуснай народнай творчасці; прывучэнне дзяцей да інтанацыйнага ладу роднай мовы; выкліканне радасці зносін з вобразным мовай твораў.

**Асноўная частка.** Паўнавартаснае беларускамоўнае развіццё дзяцей патрабуе стварэння ва ўстанове дашкольнай адукацыі нацыянальна-культурнага фону, беларускамоўнай атмасферы, якую дзеці маглі б успрымаць як натуральную. Для гэтага намі праведзена праца па адборы фальклорных твораў, папоўнена прадметнае развіваючае асяроддзе: сканструяваны настольныя тэатры, тэатр на фланэлеграфе; складзена картатэка беларускіх народных гульняў; створана бібліятэка беларускіх народных казак, пацешак, вершаў, загадак, прыказак, прымавак, заклікаў, забаўлянак, лічылак, картатэка беларускіх рухомых гульняў; падабрана неабходная метадычная літаратура, набыты малюнкі адзення розных строяў Беларусі, ручнікі, жаночы нацыянальны касцюм, выраблены чатыры беларускія лялькі ў рознай вопратцы, якімі карыстаемся на занятках. Усё гэта спрыяе хуткай падрыхтоўцы да моўнай дзейнасці.

© Корнева Н. М., 2022

Рэпазіторый БарГУ

У ходзе працы мы намагаліся, каб кожны дзень знаходжання дзяцей у дзіцячым садзе быў цікавым і насычаным. Узбагачэнне маўлення дзяцей малымі формамі фальклору адбывалася ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці, падчас прагулак, святаў і забаў, падчас гутарак, чытання мастацкай літаратуры, у выяўленчай і тэатралізаванай дзейнасці, гульнявой і іншай сумеснай дзейнасці.

Асаблівую значнасць фальклор набывае ў першыя дні жыцця малога ў дзіцячым садзе. Малое дзіця ў перыяд адаптацыі не здольна да зносін з іншымі дзецьмі і таму знаходзіцца ў прыгнечаным стане. Пацешкі дапамагаюць усталёўваць першапачатковы кантакт выхавальніка з малымі. Для выканання гэтых задач былі падабраны пацешкі, пястушкі, забаўлянкі, калыханкі. Пры падборы мы звярталі ўвагу на тое, каб яны былі простыя, кароткія, з выразным рытмам, падахвочвалі да дзеяння, руху.

Вядома, што правядзенне некаторых рэжымных працэсаў выклікае ў малых адмоўнае стаўленне. Для таго каб дзеці мыліся, елі, распраналіся, рыхтуючыся да сну, з задавальненнем, мы ў сваёй працы звяртаемся да пацешак. Дзеці не толькі з задавальненнем выконваюць патрэбныя дзеянні, але і запамінаюць пацешкі, развіваюць памяць і ўзбагачаюць свой слоўнікавы запас. Яны лаканічныя і выразныя па форме, глыбокія і рытмічныя. З іх дапамогай дзеці вучацца выразнаму і звонкаму вымаўленню, праходзяць «школу» мастацкай фанетыкі. Прывучаючы дзяцей рэгулярна мыць рукі, мы выкарыстоўваем пацешку «Коцік прачынаецца, лапкай вымываецца...». Рытмічныя словы выклікаюць у дзяцей радасць, яны з задавальненнем падстаўляюць рукі пад струмень вады, а некаторыя самастойна спрабуюць падцягнуць рукавы. Пацешкі здольны карэктаваць паводзіны дзяцей, ствараць у іх добры настрой. Дапамагаюць пацешкі і ў працэсе кармлення. Каб выклікаць у дзяцей жаданне есці, гаворым: «Ладкі ладком, піражкі з мядком, кашка з алеем, есці мы ўмеем».

Не ўсе дзеці ахвотна кладуцца ў ложак, некаторыя адчуваюць пачуццё трывогі, сумуюць па доме, па матулі. Такія паводзіны — не рэдкасць у першыя тыдні знаходжання дзіцяці ў дзіцячым садзе. Такім дзецям ласкава спяваем песенькі: «Баю-баю-баінькі», «Ой, бычок, мой бысенька», «Люлі-люлі-люляшу», «А ты, коцінька-каток». Усё гэта дапамагае запамінаць і прайграваць у далейшым гэтыя вясёлыя пацешкі, а затым выкарыстоўваць падчас сюжэтна-ролевай гульні «Дачушкі-матулі» [2, с. 10].

Апрананне з'яўляецца складаным рэжымным працэсам. Дашкольнікі не ўмеюць і не любяць апранацца самі. Каб дзеці хутчэй асвойвалі навыкі, неабходныя для апранання, мы прагаворваем пацешку «Кукарэку, Певунок!».

Вядома, што для малодшых дашкольнікаў характэрная цяга да рытмічна-арганізаванага складу мовы, гучным мажорным рыфмам, таму яны з задавальненнем слухаюць народныя песенькі. Народныя песенькі самі па сабе з'яўляюцца міні-спектаклямі, у якіх дзіця — і слухач, і глядач, і ўдзельнік. Песенькі даюць магчымасць арганізаваць разнастайныя гульні, інсцэніроўкі і драматызацыі. Драматызацыі невялікіх песенек выклікаюць цікавасць дзяцей, імкненне быць любой дзеючай асобай. Так, у песеньцы «Сядзіць мядзведзь на калодзе» ролі мядзведзя, лісы, зайкі, сарокі дзеці выконваюць індывідуальна або калектыўна. Выконваючы песеньку, дзеці рухаюцца ў адпаведнасці з тэкстам, пры гэтым кожны праяўляе характар адлюстраванага героя.

Ёсць песенькі, якія можна перавесці ў дыялогі: «Сядзіць сыч на капе», «А ты, каток, шэры». Дарослы пытаецца, а дзіця адказвае, адлюстроўваючы вобраз свайго героя: коціка, сыча, саву. Так, пры выкананні дыялогу «Мышка-мышка, дзе была?» прапануем дзіцяці адлюстраваць мышку, выкарыстоўваючы інтанацыю, міміку. Паказваючы свае эмоцыі ў гульні, дзеці выказваюць радасць, цікавасць да твораў, значыць, ўдасканальваюць сваё маўленне, вучацца прыёмам зносін.

У сваёй працы выкарыстоўваем жанр гульнявога дзіцячага фальклору — лічылкі. Гэта славесныя, рыфмаваныя формулы, часта смешныя, дапамагаюць вызначыць чарговасць у гульні. Разам з дзецьмі прагаворваем словы лічылкі некалькі разоў. Яны невялікія па аб'ёме, і дзеці хутка і лёгка іх запамінаюць. Напрыклад, «Ішоў баран па крутым гарам» ці «Заяц-месяц, дзе ты быў?».

Выкарыстанне малых формаў фальклору мае вялікае значэнне пры правядзенні заняткаў прадуктыўнымі відамі дзейнасці. Напрыклад, пры правядзенні занятку па лепцы на тэму «Зярняткі», распавёўшы дзецям пра птушак, якім зімой вельмі холадна і галодна, можна праспяваць песеньку «Гушкі, гушкі, гушкі». На занятках па лепцы на тэму «Слімак» можна выкарыстоўваць заклік «Слімак, слімак, выпусці рожкі». На занятку па маляванні на тэму «Дождждык», выкладваючы на фланэлеграфе хмарку, чытаем: «Дождждык, дождждык, сыпані, спёку з поля прагані!». Пад рытм пацешкі малявалі кропелькі дажджу.

Галоўнае, што павінен улічыць выхавальнік пры азнаямленні выхаванцаў з рознымі фальклорнымі жанрамі, — неабходнасць прыўнесці элементы артыстычнасці, індывідуальнасці ў выкананні народных твораў. Тады заняткі будуць праходзіць, як яскравыя зносіны з дзецьмі, на вачах якіх адбываецца маляўнічае дзейства: звяры размаўляюць чалавечымі галасамі, спяваюць, гуляюць. Выкарыстанне на занятках малых формаў фальклору робіць заняткі эмацыйнымі, цікавымі, што спрыяе лепшаму засваенню матэрыялу.

Калі задачы па азнаямленні дзяцей з малымі формамі фальклору вырашаць толькі на занятках, то немагчыма дасягнуць пастаўленых мэтаў і задач, таму мы ўключаем фальклор у нерэгламентаваную дзейнасць.

На прагулцы, назіраючы за жывой і нежывой прыродай, з'явамі ў прыродзе, уключаем заклікі, пацешкі, якія дапамагаюць мэтанакіравана назіраць за з'явамі прыроды [3, с. 47]. Актыўна выкарыстоўваем пацешкі, загадкі пры знаёмстве з порамі года («Вясновыя вочкі, ідзі, зіма, прочкі…»).

Фальклор таксама дае магчымасць пазнаёміць дзяцей з жывёламі, якіх яны бачылі толькі на малюнку, фарміруе ўяўленні аб хатніх і дзікіх жывёлах, птушках і іх звычках («Чэ-чэ, чэ-чэ, сарока», «Ішла каза», «Котка шэры», «Кукарэку, певунок»). У сваёй працы мы выкарыстоўваем народныя гульні.



Репозиторий БрГУ

Гульні са словамі спрыяюць развіццю маўлення, мыслення дзіцяці, фарміраванню слоўнікавага запасу. Прапануем дзецям гульні «Го-го-го-го, гусачок», «Ідзі, ідзі, дожджык», «Дожджык льецца», «Пайшоў каток на таржок».

Пальчыкавыя гульні эмацыйныя і займальныя, яны як быццам адлюстроўваюць рэальнасць навакольнага свету — прадметы, жывёл, людзей, іх дзейнасць, з'явы прыроды.

Адгадванне і прыдумванне загадак таксама аказвае ўплыў на рознабаковае развіццё маўлення дзяцей. Для стварэння ў загадцы метафарычнага вобраза ўжываюцца розныя сродкі выразнасці (прыёмы ўвасаблення, выкарыстанне шматзначнасці слова, азначэнняў, эпітэтаў, параўнанняў, асаблівай рытмічнай арганізацыі), што спрыяе фарміраванню вобразнасці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Заключэнне.** Дзеці добра ўспрымаюць фальклорныя творы, дзякуючы іх мягкаму гумару, ненадакучліваму дыдактызму і знаёмым жыццёвым сітуацыям. Вусная народная творчасць — неацэннае багацце кожнага народа, выпрацаваны стагоддзямі погляд на жыццё, грамадства, прыроду, паказчык яго здольнасцей і таленту.

Зыходзячы з гэтага, знаёмства дзяцей з фальклорнымі творамі спрыяе развіццю іх маўлення, папаўненню і ўзбагачэнню іх слоўнікавага запасу. Паступова ў дзяцей фарміруецца ўнутраная гатоўнасць да больш глыбокага ўспрымання твораў народнай літаратуры. Зварот да добра знаёмых, любімых дзецьмі жанраў фальклору забяспечвае эфектыўнасць фарміравання самастойнай мовы дашкольнікаў.

#### Спіс цытаваных крыніц


1. *Дубініна, Д. М.* Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору : дапам. для педагогаў устаноў дашкол. адукацыі / Д. М. Дубініна. — Мінск : Новое знание, 2016. — 208 с.
2. *Пралыгіна, Н. В.* Гульні з лялькай: фарміраванне сацыяльнага вопыту і асабістых якасцей у дзяцей 3-га года жыцця сродкамі вуснай народнай творчасці ў гульнёвай дзейнасці / Н. В. Пралыгіна. — Мінск : Новое знание, 2015. — 40 с.
3. *Дубініна, Д. М.* Родная прырода ў вуснай народнай творчасці : дапам. для педагогаў дашкол. адукацыі / Д. М. Дубініна, А. А. Страха, Д. У. Дубінін. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. — 136 с.



УДК 373.21



**Королёва Наталья Апполосовна**

*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь, galateia.2010@mail.ru*


## РАЗВИТИЕ ВОСПРИЯТИЯ РЕЧИ У ДЕТЕЙ В ДОШКОЛЬНОМ ВОЗРАСТЕ: ПЕДАГОГИЧЕСКОЕ ПРОСВЕЩЕНИЕ РОДИТЕЛЕЙ


В статье рассматривается проблема развития восприятия речи у детей в дошкольном возрасте; значительное внимание уделяется организации педагогического просвещения родителей в области формирования произносительной стороны речи детей дошкольного возраста.



**Ключевые слова:** фонематический слух; дифференциация слогов; дифференциация фонем; элементарный звуковой анализ; дошкольный возраст.



**Koroleva Natalia Appolosovna,**

*Baranavichy State University, Baranavichy, the Republic of Belarus, galateia.2010@mail.ru*


## DEVELOPMENT OF SPEECH PERCEPTION IN PRESCHOOL CHILDREN: PEDAGOGICAL EDUCATION OF PARENTS


The article deals with the problem of the development of speech perception in preschool children; considerable attention is paid to the organization of pedagogical education of parents in the field of the formation of the pronunciation side of speech of preschool children.



**Key words:** phonemic hearing; syllable differentiation; phoneme differentiation; elementary sound analysis; preschool age.


**Введение.** Дошкольный возраст — уникальный период в развитии личности, в течение которого формируются и развиваются все психические функции, без которых невозможно становление человека. Речь занимает ключевое место в системе высших психических функций и, являясь основным механизмом мышления, создаёт предпосылки к активному усвоению представлений об окружающем мире и передаче знаний о нём.

В этой связи формирование у детей грамматически правильной, лексически богатой и фонетически четкой речи — одна из важнейших задач в общей системе обучения ребёнка родному языку в учреждении дошкольного образования, в семье. При усвоении грамматического строя родного языка дошкольник


© Королёва Н.А., 2022





Репозиторий БарГУ